# КАБ НЕ ДЗІРКА Ў РОЦЕ, ХАДЗІЎ БЫ Ў ЗЛОЦЕ


Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

**Пасля доўгай паўзы журналісты-«эканамісты» нашага выдання аднаўляюць дыскусіі па розных жыццёвых сітуацыях, дзе ў якасці аргументаў прымаюцца не толькі меркаванні бакоў, але і фінансавыя разлікі. Цяпер на звяздоўскай «кухні» адбыліся кадравыя змены. Гэтым разам апанентам лысаватага, але даволі эканомнага дзядзькі — Сяргея Куркача — выступае поўны сіл і энергіі 25-гадовы карэспандэнт — Ілья Крыжэвіч. Менавіта гэты юнак на працягу трох месяцаў не есць мяса і пры гэтым упэўнены, што за такі час ён у вазе і энергіі нічога не страціў і нават пэўныя грошы сэканоміў. Са свайго боку спадар Куркач, які на працягу жыцця бачыў шмат прыхільнікаў розных дыет: ад сыраедаў да тых, хто лічыць сябе веганамі (толькі раслінная ежа), упэўнены ў адваротным.**

## ЯК НЯМА МЯСА, ТО І ГРЫБ ЗАКРАСА

**Сяргей Куркач** — Дзіўны ты хлопец, Ілья! Ты ж малады, сяброў, мабыць, шмат, а з імі — на шашлыкі. Гэта ж цудоўна! А без мяса — ты «батанам» станеш! Будзеш потым на перакладзіне вісець, як гліст. Мужыку энергія патрэбна, а яна якраз у мясе і ёсць.

**Ілья Крыжэвіч** — З шашлыкамі разам гарэлачка п'ецца, а я, наколькі вы ведаеце, падобны напой увогуле не ўжываю. З турнікам не мяса ў пузе ў якасці ежы сябруе, а мазалі на руках і сіла волі. І наконт энергіі — пытанне даволі спрэчнае.

Я якраз ад мяса і адмовіўся, бо гэта цяжкі для чалавека прадукт, які засвойваецца складаней, чым раслінная ежа. Каб атрымаць энергію, кожнаму ў рацыёне неабходны бялкі, тлушчы, амінакіслоты і вугляводы, але мала хто ведае, што знайсці іх можна не толькі ў прадуктах жывёльнага паходжання. Так, у нас лічыцца, што мяса з'яўляецца асноўным пастаўшчыком бялкоў, якія «выбудоўваюць» арганізм. Але бялкі ёсць таксама і ў раслінная ежы, напрыклад, у бабовых культурах.

**С.К.** — Дзякуй табе, хлопча, за лекцыю. Ты мне лепш растлумач, якім чынам — мехам капусты ці нейкай іншай «травой» — будзеш гэты набор амінакіслот і бялкоў замяшчаць? Такую замену падабраць можна, але новы спіс прадуктаў, мне здаецца, яшчэ тую капейку каштаваць будзе.

**І.К.** — Заблыталіся вы нешта, Сяргей Андрэевіч. Я вам не веган, які-небудзь — не ем толькі мяса і рыбу. А малако, тварог, смятану — ужываю. Гэта не адбіваецца на маім бюджэце адмоўна, наадварот, на некаторых пазіцыях я нават эканомлю.

**С.К.** — Ага, цяпер мне яшчэ скажы, што ў цябе бабуля ў лесе жыве, таму замест мяса выключна грыбы і ясі. Шчыры беларус з цябе атрымліваецца, якому калі няма мяса, то і грыб закраса. А, можа, у гэтым лесе ты і арэхі розныя мяхамі збіраеш?

**І.К.** — Не, сваякоў у лесе ў мяне няма, а вось грыбы і арэхі я сапраўды люблю. Гэта вельмі карысна для арганізма. Напрыклад, у грыбах выяўлена 18 амінакіслот, восем з якіх з'яўляюцца незаменнымі, бо не могуць утварацца ў чалавечым арганізме і паступаюць сюды толькі з ежай. А арэхі разам з мясам і рыбай уваходзяць у групу каштоўных крыніц бялку.

**С.К.** — Здымаю капялюш за лекцыю № 2 — пра здаровую ежу, спадар Крыжэвіч. Ну а цяпер давай падлічым, колькі гэтыя далікатэсы каштаваць будуць.

## ШЫРОКАЯ ЛЫЖКА РОТ ДЗЯРЭ

**І.К.** — Папярэдне перад адмаўленнем ад мяса я падлічыў, колькі майму арганізму патрэбна бялку. Пасля чаго склаў прыкладны спіс прадуктаў на дзень і на месяц. Удзень мне неабходна з'есці 4 яйкі, 250 грамаў бабовых, пачак тварагу (200 г), цвёрдага сыру 150 грамаў, паўлітра малака. Калі перавесці гэты спіс на грошы, то ў месяц з маёй кішэні знікае прыблізна 1,4-1,5 млн рублёў на бялок.

**С.К.** — Ну і што? Ты на гэтым кропку паставіў? А дзе твае грыбы і арэхі? Вырашыў ад мяса адмовіцца — будзь ласкавы, ужывай каля двух кілаграмаў свежых грыбоў у месяц. У нашым выпадку гэта будуць шампіньёны па 50 тысяч за кіло. Нават па мінімуме табе спатрэбіцца яшчэ каля кілаграма вылушчаных грэцкіх арэхаў (350 тысяч рублёў), па 300 грамаў фісташак і міндалю, што ў суме пацягне яшчэ на 220 тысяч рублёў. Прыплюсуй да сваёй сумы гэтыя 670 тысяч абавязкова.

**І.К.** — Ды вы гурман, спадар Куркач. Я так шмат грыбоў не ем. Ды і пра арэхі накшталт фісташак часам забываюся, бо яны, вядома, смачныя, але каштуюць... Я лепш пару кіло арахісу куплю па 70 тысяч за кілаграм.

**С.К.** — Сумнiўная замена. У маёй сям'і дзеткі і рыбу, і мяса ядуць, але яны за месяц каля кілаграма грэцкіх арэхаў у якасці дэсерту ўжываюць. Дарэчы, пра рыбу мы забыліся. Фосфар ты адкуль бярэш? Ды і ёд табе патрэбны.

**І.К.** — Фосфару хапае ў яечным жаўтку, тварагу і сыры. А ёд можна знайсці перш за ўсё ў марской капусце. Не больш за 300 грамаў такой капусты мне будзе дастаткова на тыдзень. Таму ў месяц на яе аддаю каля 60 тысяч рублёў. Дарэчы, дзякуй, што нагадалі, буду больш есці гэтых прадуктаў.

**С.К.** — Цяпер дакладна падаб'ем кошт тваёй мяса-рыбнай замены. Плюсуем твае паўтара мільёна да 670 тысяч на арэхі і 60 тысяч на капусту. Во, згадзіся, цікавы сказ атрымаўся, нібыта рацыён разглядаем для «элітнай кароўкі». Ты тут моцна не крыўдуй. Твая замена пацягнула на 2,2 млн рублёў. Ну а цяпер давай падлічым, колькі мае рыба і мяса каштаваць будуць. Мяса я куплю на сям'ю з пяці чалавек двойчы ў месяц, а рыбу — штотыднёва. Для катлет звычайна бяру свініну, дзе 60% кумпяк на костцы і 40% сырога шпіку. Такі кумпяк сёння можна знайсці ў асобных крамах за 50 тысяч рублёў (па акцыі), а шпік — па 20 тысяч за кіло. У катлеты дабаўляю і іншыя інгрэдыенты, але мясны сабекошт іх будзе складаць недзе каля 35 тысяч рублёў за кг. У месяц такім чынам мая сям'я «топча» каля 5-6 кг свініны.

Адбіўныя мы робім з курынай грудкі. Іх на месяц таксама 5-6 кг трэба. А каштаваць яны будуць каля 45 тысяч рублёў за кіло (таксама на акцыі). Вось і атрымліваецца, што на мяса мая сям'я аддае каля 600 тысяч рублёў.

**І.К.** — А ці не зарана вы падлік ужо зрабілі? А дзе рыба і каўбасы?

**С.К.** — Астынь, хлопча, я свой калькулятар яшчэ не зачахляў. З марской рыбы мы бяром скумбрыю і мінтая, дзе кіло каштуе 40-45 тысяч рублёў. Купляем у месяц па 3 кг кожнай. Сюды запісваем і 3 кг філе пангасіуса па 55-60 тысяч рублёў за кіло. На рыбу выходзіць 450 тысяч рублёў. Прыплюсуем сюды 200 тысяч на сёмгу, якую я дома самастойна салю для дзетак, і 100 тысяч на салёны селядзец для салатаў пад шубай. Будзе 750 тысяч на рыбу і 600 тысяч на мяса. Цяпер усяго атрымліваем 1,35 млн рублёў. Аднак без каўбас таксама не абыходзімся. Для бутэрбродаў дзецям у школу купляем сыравэнджаную і паўсухую каўбасу прыкладна па 140 тысяч рублёў за кіло. Тут у месяц 280 тысяч будзе. Яшчэ прыклада 200 тысяч аддаём на вараную каўбасу. Вось цяпер усё — 1,83 млн рублёў у месяц на пяць чалавек. Можа што забыўся па дробязі — прабачце.

### РЭЦЭПТ АРЫГІНАЛЬНЫХ КАТЛЕТ ДЛЯ ДЗЯЦЕЙ АД КУРКАЧА

***Склад:** 600 грамаў свініны, 200 грамаў шпіку, 300 грамаў курынай грудкі, 150 грамаў белага хлеба і 100 грамаў малака, дзве сярэднія цыбуліны і 5-6 зубкоў часнаку, 200 грамаў 20%-й смятаны, соль на смак.* Свініну, шпік і цыбулю двойчы круцім праз мясарубку. Размінаем часнок і заліваем вадою (100 грамаў). Сухі белы хлеб кладзём у малако. Бяром часночную ваду і ўсе астатнія інгрэдыенты і яшчэ раз круцім мясарубкай. Хуценька абсмажваем з двух бакоў на патэльні. Канчаткова даводзім у разагрэтай духоўцы на працягу 20 хвілін.

## ХТО ПЕРАБІРАЕ — З ГОЛАДУ ПАМІРАЕ

**І.К.** — А вы хітрун. Да маіх бялкоў дадалі самыя дарагія арэхі і амаль вядро грыбоў з магазіна. А самі дзецям малака і тварагу пашкадавалі.

**С.К.** — Малако мы п'ём літрамі, а смятану ўжываем лыжкамі. Але гэта ежа ў нас не замяняе мяса, як у цябе. Мы малако не п'ём бітонамі, як ты, а яйкі не жуём кошыкамі. Нам любая сеежазгатаваная ежа падабаецца. Ды і арэхі мы любім усялякія. Увогуле меню нашай сям'і больш разнастайнае за кошт мяса і рыбы. А калі ты са свайго спіса харчовых прадуктаў гэтыя сур'ёзныя радкі выкрасліў, тады іх неабходна нечым іншым кампенсаваць. І па грашах такая замена каштуе нават больш. Я дзесьці чуў, што тым, хто адмаўляецца ад мяса, трэба ў рацыён абавязкова ўводзіць авакада. Там даволі шмат калію, натрыю, кальцыю, фосфару, марганцу, магнію і іншых мінеральных рэчываў. Авакада канцэнтруе памяць, зніжае рызыку ўзнікнення сардэчна-сасудзістых захворванняў, і ўсё гэта дзякуючы поліненасычаным кіслотам, якія ўваходзяць у яго склад. Менавіта таму гэты плод папулярны ў вегетарыянскай кухні, дзе выкарыстоўваецца для вегетарыянскіх сушы, а таксама як альтэрнатыва яйкам і мясу. Праўда, і каштуе гэты заморскі цуд нятанна — больш за 100 тысяч рублёў кіло.

**І.К.** — Не жадаю я вашага авакада. Яно як мыла на смак.

**С.К.** — А у тваім выпадку, з рацыёнам без мяса і рыбы, перабіраць не вельмі разумным будзе. Выключна яйкамі і гарохам мяса замясціць цалкам не атрымаецца. Гэта маё ўласнае меркаванне, як бацькі траіх дзетак. А ўвогуле мне здаецца, што падобная безмясная дыета апрыёры таннай быць не можа. Ты паспрабуй у рэстаране спецыяльны вегетарыянскі абед заказаць...

**І.К.** — А, відаць, самі ўжо спрабавалі? У вашым узросце суп з морквы лепш сёрбаць, а не вялікую адбіўную ўмінаць за абедзве шчакі.

**С.К.** — Недзе ты часткова і маеш рацыю. На сваёй працы я сякерай не махаю і, на жаль, у «качалку», як ты, не хаджу. Таму мяса мне шмат і не трэба. Але адмаўляцца ад яго, і тым больш ад рыбы, я не збіраюся. А ў тваім выпадку гэта быў вельмі смелы і, магчыма, не цалкам асэнсаваны крок. Не буду цябе пераконваць у адваротным, але проста параю здаць сваю кроў на аналіз. Ты вось неяк казаў, што самое адчуванне ў цябе добрае і важыць менш не стаў, дык хай спецыялісты гэта пацвердзяць.

**І.К.** — Я вашай парадай скарыстаюся толькі ў тым выпадку, калі вы са мной пойдзеце. Тады і паглядзім, якая ў вас «чырвоненькая».

**С.К.** — А пайшлі. Калі ў пашпарце без года пяцьдзясят, то сваё здароўе ў прафесіяналаў правяраць трэба, а не толькі на «кухні».

**Сяргей КУРКАЧ.** *Kurkach@zviazda.by*
**Ілья КРЫЖЭВІЧ.** *Kryzhevich@zviazda.by*


**ГОДОВОЙ ОТЧЕТ ЭМИТЕНТА ЦЕННЫХ БУМАГ**
**ОТКРЫТОЕ АКЦИОНЕРНОЕ ОБЩЕСТВО**
**«МИНСККОНТРАКТ»**
**220088, г. Минск, ул. Смоленская, 25, УНП 100251588**

**БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 января 2016 г.** (млн руб.)

| АКТИВЫ | |
|---|---|
| **Долгосрочные активы** | **53166** |
| в том числе: | |
| Основные средства | 52146 |
| Нематериальные активы | 3 |
| Вложения в долгосрочные активы | 53 |
| Долгосрочные финансовые вложения | 964 |
| **Краткосрочные активы** | **111454** |
| в том числе: | |
| Запасы | 32799 |
| Расходы будущих периодов | 2465 |
| Налог на добавленную стоимость по приобретенным товарам, работам, услугам | 41 |
| Краткосрочная дебиторская задолженность | 72493 |
| Денежные средства и их эквиваленты | 2864 |
| Прочие краткосрочные активы | 792 |
| **БАЛАНС** | **164620** |

| СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ И ОБЯЗАТЕЛЬСТВА | |
|---|---|
| **Собственный капитал** | **68096** |
| в том числе: | |
| Уставный капитал | 43886 |
| Резервный капитал | 255 |
| Добавочный капитал | 15497 |
| Нераспределенная прибыль | 8458 |
| **Долгосрочные обязательства** | **204** |
| в том числе: | |
| долгосрочные обязательства по лизинговым платежам | 204 |
| **Краткосрочные обязательства** | **96320** |
| в том числе: | |
| Краткосрочные кредиты и займы | 22682 |
| Краткосрочная кредиторская задолженность | 73638 |
| **БАЛАНС** | **164620** |

**ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ за январь – декабрь 2015 г.**

| Наименование показателей | млн руб. |
|---|---|
| Выручка от реализации продукции, товаров, работ, услуг | 344043 |
| Себестоимость реализованных продукции, товаров, работ, услуг | 300823 |
| **Валовая прибыль** | **43220** |
| Расходы на реализацию | 27366 |
| **Прибыль (убыток) от реализации продукции, товаров, работ, услуг** | **15854** |
| Прочие доходы по текущей деятельности | 40884 |
| Прочие расходы по текущей деятельности | 43806 |
| **Прибыль (убыток) от текущей деятельности** | **12932** |
| *Доходы по инвестиционной деятельности* | *1351* |
| в том числе: доходы от выбытия основных средств, нематериальных активов и других долгосрочных активов | 12 |
| доходы от участия в уставном капитале других организаций | 4 |
| проценты к получению | 1335 |
| *Расходы по инвестиционной деятельности* | *18* |
| в том числе: расходы от выбытия основных средств, нематериальных активов и других долгосрочных активов | 18 |
| Доходы по финансовой деятельности | *12136* |
| в том числе: курсовые разницы от пересчета активов и обязательств | 12136 |
| Расходы по финансовой деятельности | *25331* |
| в том числе: проценты к уплате | 5943 |
| курсовые разницы от пересчета активов и обязательств | 19382 |
| прочие расходы по финансовой деятельности | 6 |
| **Прибыль (убыток) от инвестиционной, финансовой и иной деятельности** | **11862** |
| **Прибыль (убыток) до налогообложения** | 1070 |
| Налог на прибыль | 853 |
| Изменение отложенных налоговых активов | 0 |
| **Чистая прибыль (убыток)** | **217** |

1. Доля государства в уставном фонде эмитента (всего в %) – 54,22.
2. Количество акционеров – всего 793.
В том числе: юридических лиц – 2, физических лиц – 791.
3. Информация о дивидендах и акциях:

| Наименование показателей | Единица измерения | За отчетный период | За аналогичный период прошлого года |
|---|---|---|---|
| Начислено на выплату дивидендов в данном отчетном периоде | миллионов рублей | 2301 | 966 |
| Фактически выплаченные дивиденды в данном отчетном периоде | миллионов рублей | 1717 | 709 |
| Дивиденды, приходящиеся на одну акцию (включая налоги) | рублей | 9176 | 3850 |
| Дивиденды, фактически выплаченные на одну акцию (включая налоги) | рублей | 9176 | 3850 |
| Обеспеченность акции имуществом общества | тысяч рублей | 271,5 | 278,8 |
| Количество простых акций, находящихся на балансе общества, – всего | штук | 0 | 930 |

4. Среднесписочная численность работающих (человек) – **117.**
5. Основные виды продукции или виды деятельности, по которым получено двадцать и более процентов выручки от реализации товаров, продукции, работ, услуг: **оптовая торговля.**
6. Дата проведения годового общего собрания акционеров, на котором утверждался годовой бухгалтерский баланс за отчетный год: **24 марта 2016 г.**
7. Сведения о применении эмитентом свода правил корпоративного поведения: Регламент работы с реестром владельцев ценных бумаг, утвержденный протоколом №23 на общем собрании акционеров от 26.03.2010 г.

Генеральный директор В.Л. Плавский
Главный бухгалтер И.С. Шавель



**Извещение о проведении 27 апреля 2016 г. аукциона по продаже права на заключение договора аренды земельного участка сроком на 99 лет для индивидуального жилищного строительства в Клейниковском сельском Совете Брестского района Брестской области**

| №№ лота | Предмет аукциона | Площадь, га | Начальная стоимость, бел. руб. | Задаток, бел. руб. | Целевое назначение земельного участка | Возмещение затрат на организацию и проведение аукциона, убытки (бел. руб.) |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Земельный участок в аг. Клейники, ул. Новая, 3 121281204601000803 | 0,1396 | 36 485 410 | 3 648 541 | строительство и обслуживание одноквартирного жилого дома | 1. 10 677 400 – за изготовление документации и регистрацию участка; 2. оплата за объявления по актам выполненных работ |

По улице Новой в аг. Клейники централизовано проходят сети газоснабжения и электроснабжения.

**Аукцион будет проводиться 27.04.2016 в 15.00 по адресу: Брестский район, аг. Клейники, ул. 60 лет Октября, 2 (здание сельисполкома).**

Для участия в аукционе необходимо подать заявление об участии в аукционе, копию платежного поручения, подтверждающего внесение на расчетный счет Клейниковского сельисполкома № 364100000288 в филиале № 100 БОУ АСБ «Беларусбанк», МФО 246, УНП 200177417, код платежа 4002, задатка в размере 10% от начальной стоимости, документ (паспорт), подтверждающий личность покупателя.

Возмещение затрат на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением документации, необходимой для его проведения осуществляется победителем аукциона либо единственным участником несостоявшегося аукциона по актам выполненных работ.

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: аг. Клейники, ул. 60 лет Октября, 2 (здание сельисполкома) с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 по рабочим дням. Последний срок подачи заявлений 21 апреля 2016 года.**

Контактные телефоны: 93 41 35, 93 41 16.



В связи с утерей свидетельство о государственной регистрации частного производственно-торгового унитарного предприятия «Идеалшанс» (УНП 490628892) **считать недействительным.** УНП 191903970